Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-03-13

# Сакавік

**21 – Дудчанка Мікалай Рыгоравіч** (1944), харэограф, рэжысёр, сцэнарыст, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, балетмайстар-пастаноўшчык Дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» – 70 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Хадоска Алег Ігаравіч** (1964), кампазітар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002) – 50 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Гаўрыіл Беластоцкі** (1684, каля Беластока – 1690), святы пакутнік-дзіцятка Беларускай Праваслаўнай Царквы – 330 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Кур'ян Уладзімір Мітрафанавіч** (1954, Мінск), кампазітар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992), заслужаны дзеяч мастацтваў Аўтаномнай Рэспублікі Крым – 60 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Скрамблевіч Мар'ян Антонавіч** (1939, Гродзенскі р-н), народны музыкант, майстра па вырабе і рэстаўрацыі народных духавых і ўдарных інструментаў, якія выкарыстоўваюць артысты прафесійных і аматарскіх калектываў, – 75 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Ляшэнка Ларыса Дзмітрыеўна** (1914, Вільня – 2004), дзеяч самадзейнага мастацтва, балетмайстар, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Маракоў Валерый Дзмітрыевіч** (1909, Мінскі р-н – 1937), беларускі паэт, перакладчык – 95 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Кастусь Цвірка** (Канстанцін Аляксеевіч; 1934, Старадарожскі р-н), беларускі паэт, перакладчык, фалькларыст, выдавец, этнограф – 80 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Палтаран** (Ляпеская) **Вера Сямёнаўна** (1919, Петрыкаўскі р-н – 1989), пісьменніца, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя П.М. Лепяшынскага (1970) – 95 гадоў з дня нараджэння.

**30 – Брастоўскі** (ці Бжастоўскі) **Павел Ксаверы** (1739, Глыбоцкі р-н – 1827), грамадскі і дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, рэфарматар, мецэнат, перакладчык, заснавальнік першай у Еўропе «сялянскай рэспублікі» – 275 гадоў з дня нараджэння.

**31 – Музей гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі** (Мінск; 1989) – 25 гадоў з часу адкрыцця.